выбар кума і кумы, падрыхтоўка бабкай-павітухай абрадавай стравы – кашы, абрад хрышчэння дзіцяці, хрэсьбіннае застолле, абрад разбівання гаршка з кашай, дзяльба кашы, рытуалы ўшанавання бабкі-павітухі, адорванне падарункамі бабкі і жанчыны-парадзіхі [1, с. 8]. Звернемся непасрэдна да фактычных матэрыялаў па радзінна-хрэсьбіннай абраднасці, запісаных летам 2014 г. у палявой экспедыцыі на тэрыторыі Гомельскага раёна, і засяродзім увагу на прыкметах і павер’ях, звязаных з цяжарнасцю жанчыны. Напрыклад, паводле ўспамінаў жыхароў Гомельскага раёна, цяжарнай жанчыне забаранялася што-небудзь рэзаць або секчы: *«Цяжарнай іменна нельзя было ў празнік ні секць нічога, ні рэзаць нічога. Нічаво! Самае глаўнае, ежалі беременная жэншчына, вот слухайце, не дай, Бог, абыйдзіся ў празнік: не адсякай, не рэж нічаво»* (запісана ў в. Старыя Дзятлавічы ад Ткачовай Алены Варфаламееўны, 1929 г. н.). Цяжарныя жанчыны пазбягалі красці, здзіўляцца з людзей з фізічнымі недахопамі: *«Нельзя было тежарной воровать, потому что у ребенка родимое пятно будет. Когда испугаешься, не дай, Бог, ухватиться за лицо, потому что как схватишься, так и останется на ребенке такое пятно. Еще нельзя на людей смотреть некрасивых, потому что ребенок будет некрасивый»* (запісана ў в. Грабаўка ад Белавус Ларысы Рыгораўны, 1936 г. н., перасяленкі з в. Пагоннае Хойніцкага р-на), *«Як ходзіш у палажэнні, то нельзя было хапацца за ліцо рукамі. Трэба было насіць фартух, штоб не быў дзіцёнак урочаны (не баяўся ўроку)»* [1, с. 173].

Прыведзеныя матэрыялы па прыкметах і павер’ях, запісаных у вёсках Гомельскага раёна, раскрываюць асаблівасці светапогляду нашых продкаў і сведчаць аб архаічнасці іх мыслення.

**Літаратура**

1 Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі беларусаў (на матэрыяле фальклору Гомельскай вобласці) / аўтары-ўкладальнікі Новак В. С., Шынкарэнка В. К., Кастрыца А. А., Воінава А. М., Вяргеенка С. А., Палуян А. М., Партнова-Шахоўская А. У. – Гомель: Барк, 2013. – 380 с.

***А. М. Сапегина***
*Науч. рук.* ***Н. В. Суслова****,*
*канд. филол. наук, доцент*

## СПЕЦИФИКА ЧУВСТВЕННОГО АСПЕКТА КАРТИНЫ МИРА МАРИИ СТЕПАНОВОЙ

Буквально в каждом отклике литературной критики на публикации стихотворений одного из наиболее ярких поэтов современной России Марии Степановой в разных вариантах звучит мысль о том, что ее художественный мир отличается особой пластичностью. С нашей точки зрения, пластичность художественной реальности, возникающей в поэзии М. Степановой, главным образом достигается за счет акцентуации ее чувственного аспекта. Чувственный аспект художественной картины мира М. Степановой наиболее полно представлен в цветовых и гастрономических образах. В результате анализа текстов поэтических произведений М. Степановой, вошедших в сборник «О близнецах» [1], мы пришли к следующим выводам.

Цвет в лирике поэтессы (колоративы наблюдаются в 37 лирических произведениях из 77, включенных в сборник) имеет символический смысл и может реализовываться как в положительном, так и в отрицательном значениях. Наиболее частотными цветами в стихотворениях сборника являются белый, черный и красный цвета, поэтому общая цветовая гамма, характеризующая сборник «О близнецах», может быть определена как

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

красно-черно-белая. Устойчивая символика цвета придает картине мира Марии Степановой точность и пластичность.

Гастрономические образы поэзии М. Степановой, присутствующие в 17 стихотворениях сборника, наиболее частотными из которых являются образы молока, яйца, хлеба, жира, вина, пива, в качестве основной функции предназначаются для маркирования эмоциональных состояний лирической героини.

Таким образом, поэтика М. Степановой – это поэтика сложных многомерных ассоциаций, опосредованных многочисленными культурными кодами, порой взаимоисключающими, но при этом функционирующими одновременно. Подчеркнуто «культурный» текст поэтессы имеет выражено чувственный способ реализации, связанный с активным выделением телесного компонента.

### Литература

1 Степанова, М. О близнецах / М. Степанова // Вавилон: Тексты и авторы [Электронный ресурс]. – 2014. – Режим доступа: http://www.vavilon.ru/texts/stepanova2.html. – Дата доступа: 02.05.2014

***Я. А. Сычова***
*Навук. кір.* ***А. У. Андрэева,***
*асістэнт*

## АДМЕТНАСЦІ ПАЭЗІІ АНАТОЛЯ СЫСА

Беларуская зямля багатая на сапраўдныя таленты, якія здольныя данесці сваё слова да душаў людзей. Адным з такіх талентаў з'яўляецца выдатны паэт-філосаф, выключная постаць беларускай літаратуры, чалавек, які разбураў рэальны сусвет на маленькія часткі і будаваў з іх свой таямнічы, загадковы свет, Анатоль Сыс. Усе падзеі жыцця, перажыванні, пачуцці асэнсоўваюцца аўтарам нібы двойчы, разглядаюцца з розных бакоў: радасць і ў той жа час пакуты, каханне і самота, жыццё, а побач з ім і смерць.

Асноўнымі матывамі творчасці філасофскай накіраванасці Анатоля Сыса з'ўляюцца воля, жыццё, каханне, смерць, адзінота. Нельга не заўважыць спецыфічныя адметнасці яго паэтычнага стылю, бо творчасць аўтара сапраўды зачароўвае. Многія вершы маюць рысы экспрэсіянізму, паэт адлюстроўвае зямное жыццё ў змрочных фарбах, з усімі яго драмамі і трагедыямі. Некаторыя вобразы пужаюць, аднак гэтым надаюць творам своеасаблівы настрой. У ягонай паэзіі можна заўважыць сімбіёз вобразаў чалавека і звера, бо і сам паэт асацыюе сябе то з птушкай, то з сабакам, ваўком – вольным, незалежным, самотным. Анатоль Сыс – сапраўдны мастак змрочнай паэзіі. Яго імя можна ставіць побач са славутымі імёнамі Эдгара Алана По і Андрэаса Грыфіуса, бо вобразы, якія ён стварае,неверагодна цікавыя і прываблівыя, змрочныя і таямнічыя.

Творчасць аўтара выключна метафарычная. У ёй можна знайсці адметныя вобразы, не падобныя да класічных беларускіх: "Беларусь мая, мая магіла… / І калі вясёлка над труной / Вып'е кроў да кроплі з маіх жылаў, / Беларусь, накрый мяне зямлёй" [1, с. 242]. Такое своеасаблівае ўспрыняцце свету з'яўляецца нейкім шыфрам, сімвалам, разгадаючы які, можна ўбачыць душу паэта. Аднак гэта немагчыма, бо, як гаварыў Максім Багдановіч, "…Не паняць таго ніколі, / Не разведаць, не спазнаць: / Не даюць мне думаць зыкі, / Што ляцяць, дрыжаць, звіняць. / Песня рвецца і ліецца / На раздольны, вольны свет. / Але хто яе пачуе? / Можа толькі сам паэт" [2].

### Літаратура

1 Сыс, А. Лён: выбраныя творы / Анатоль Сыс. – Мінск: Кнігазбор, 2006. – 435 с.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ